ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад начальніка ўпраўлення
адукацыі Гомельскага
гарвыканкама
ад 15.11. 2024 № 319

ПРАГРАМА
правядзення канферэнцыі
вучэбна-даследчых работ вучняў
"Мележаўскія чытанні"

Дата правядзення этапу абароны работ: 14 снежня 2024 г.

Месца правядзення: ДУА "Гімназія № 36 г. Гомеля імя І.Мележа"
(г. Гомель, вул. Бр.Лізюковых, 16)

10.00-11.00 – рэгістрацыя ўдзельнікаў Чытанняў

11.00-11.40 – адкрыццё канферэнцыі вучэбна-даследчых работ вучняў "Мележаўскія чытанні"

11.50-15.30 – работа секцый

15.30-16.00 – падзвядзенне вынікаў, наведванне буфета, наведванне мемарыяльнага музея братоў Лізюковых

16.10-16.40 – падвядзенне вынікаў Чытанняў, узнагароджванне пераможцаў

З 16.40 – ад'езд удзельнікаў

Дадатак
да загаду начальніка ўпраўлення адукацыі Гомельскага гарвыканкама
ад 15.11. 2024 № 319

ПАЛАЖЭННЕ
аб канферэнцыі вучэбна-даследчых работ вучняў
“Мележаўскія чытанні”

1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Арганізатары: канферэнцыя вучэбна-даследчых работ вучняў “Мележаўскія чытанні” (далей - канферэнцыя) праводзіцца дзяржаўнай установай адукацыі “Гімназія № 36 г. Гомеля імя І.Мележа” пры падтрымцы галоўнага ўпраўлення адукацыі Гомельскага аблвыканкама, упраўлення адукацыі Гомельскага гарвыканкама.

Срокі правядзення канферэнцыі: лістапад 2024 – снежань 2024.

Месца правядзення: дзяржаўная ўстанова адукацыі “Гімназія № 36 г. Гомеля імя І.Мележа”

2. МЭТЫ І ЗАДАЧЫ КАНФЕРЭНЦЫІ:

развіццё інтэлектуальнага патэнцыялу вучняў, далучэнне іх да даследчай дзейнасці, набыцця імі вопыту пазнаваўчай, камунікатыўнай, практычнай, творчай дзейнасці;

выхаванне патрыятызму, актыўнай грамадзянскай пазіцыі асобы вучня, умацаванне гістарычнай памяці беларускага народа;

павышэнне цікавасці вучняў да культурнай спадчыны і славутых імёнаў свайго народа;

умацаванне і развіццё супрацоўніцтва паміж установамі агульнай сярэдняй адукацыі горада, краіны і бліжэйшага замежжа.

3. УДЗЕЛЬНІКІ КАНФЕРЭНЦЫІ

Удзельнікамі канферэнцыі могуць быць вучні VII – XI класаў або творчыя групы вучняў (да 2 чалавек) устаноў агульнай сярэдняй адукацыі Беларусі і бліжэйшага замежжа.

4. КІРАЎНІЦТВА КАНФЕРЭНЦЫЯЙ

Кіраўніцтва канферэнцыяй ажыццяўляе арганізацыйны камітэт (далей - аргкамітэт), які вядзе работу па падрыхтоўцы і правядзенні канферэнцыі, фарміруе журы з ліку спецыялістаў устаноў адукацыі

г. Гомеля, спіс удзельнікаў, пратаколы журы, выніковы пратакол, каштарыс выдаткаў канферэнцыі, вырашае іншыя пытанні па арганізацыі работы канферэнцыі.

Склад арганізацыйнага камітэта і членаў журы зацвярджаецца загадам начальніка ўпраўлення адукацыі Гомельскага гарвыканкама.

## 5. ПРАВЯДЗЕННЕ КАНФЕРЭНЦЫІ

Работа канферэнцыі адбываецца ў 2 секцыях:

“Мой родны кут” (этнаграфія, краязнаўства);

“Мова маёй зямлі” (мова і літаратура беларускага, рускага і іншых славянскіх народаў).

## 6. ПАРАДАК АРГАНІЗАЦЫІ КАНФЕРЭНЦЫІ

Канферэнцыя праводзіцца ў 2 этапы:

*Адборачны этап* праводзіцца з 25.12.2024 па 03.12.2024. Экспертны савет вывучае работы і вызначае лепшыя, дапушчаныя да другога этапу (абароны) у адной з дзвюх секцый. Да абароны дапускаецца не больш за 48 работ у кожнай секцыі.

*Этап абароны вучэбна-даследчых работ* адбудзецца 14 снежня 2024 года.

Да абароны дапускаюцца работы, якія прайшлі адборачны этап. Абарона работ прадугледжвае публічнае выступленне да 7 хвілін па выніках даследчай дзейнасці. Пры абароне вучэбна-даследчых работ удзельнікі канферэнцыі вызначаюць мэты, задачы, асноўныя праблемы, аналізуюць крыніцы, абгрунтоўваюць свае вывады і адказваюць на пытанні журы.

Цырымонія адкрыцця канферэнцыі адбудзецца 14.12.2024 года ў 11.00.

## 7. ПРАДСТАЎЛЕННЕ РАБОТ І ЗАЯВАК НА ЎДЗЕЛ У КАНФЕРЭНЦЫІ

7.1. Удзел у канферэнцыі можа быць індывідуальны або групавы (да 2 вучняў).

Удзельнікі ў тэрмін **да 23.11.2024 уключна:**

праходзяць ***рэгістрацыю*** на сайце гімназіі https://gimn36gomel.schools.by.

і прадастаўляюць ***друкаваны варыянт*** даследчай работы ў арганізацыйны камітэт гімназіі.

7.2. Даследчыя работы на канферэнцыю павінны быць прадстаўлены (прывезены або дасланы па пошце 246 029 г. Гомель, вул. Бр. Лізюковых, 16) ў друкаваным выглядзе, афармленыя ў адпаведнасці з патрабаваннямі да афармлення рэфератаў (Глава VI Метадычных рэкамендацый па фарміраванні культуры вуснага і пісьмовага маўлення ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі ад 21.08.2023). Кожная работа суправаджаецца тытульным лістом (дадатак).

7.3. Спісы ўдзельнікаў канферэнцыі, якія дапушчаны да этапу абароны работ, публікуюцца **03.12.2024** на сайце гімназіі (https://gimn36gomel.schools.by).

7.4. **Да ўдзелу ў канферэнцыі не дапускаюцца** вучэбна-даследчыя работы, якія сталі пераможцамі Гомельскай абласной навукова-практычнай канферэнцыі вучняў "Пошук", работы, аўтары якіх не прайшлі рэгістрацыю да 24.11.2024, а таксама работы, афармленыя з парушэннем п.7.2. дадзенага палажэння і дасланыя пасля 25.11.2024.

7.5. Вучэбна-даследчыя работы, якія не з'яўляюцца пераможцамі канферэнцыі, можна забраць у арганізацыйным камітэце **да 01.02.2025.**

7.7. Дадатковую інфармацыю аб правядзенні Мележаўскіх чытанняў можна атрымаць на сайце гімназіі (https://gimn36gomel.schools.by), у арганізацыйным камітэце дзяржаўнай установы адукацыі "Гімназія № 36 г. Гомеля імя І.Мележа", па тэл. (0232) 26 48 65.

## 8. КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ ВУЧЭБНА-ДАСЛЕДЧЫХ РАБОТ

Змястоўная частка (да 20 балаў): актуальнасць тэмы, практычная значнасць работы, навуковасць, элементы даследавання, пераканаўчасць зробленых высноў.

Афармленне работы (да 10 балаў): эстэтычнасць афармлення, **адпаведнасць патрабаванням** Метадычных рэкамендацый па фарміраванні культуры вуснага і пісьмовага маўлення ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі ад 21.08.2023, якасць афармлення дадаткаў, адпаведнасць выкарыстанай літаратуры тэме работы.

Ацэнка выступлення вучняў падчас этапа абароны работ (да 20 балаў): вытрымка рэгламенту выступлення да 7 хвілін, прадстаўленне, логіка і цікавасць падачы матэрыялу, пастаноўка задач, культура мовы.

9. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ КАНФЕРЭНЦЫІ

14.12.2024 на пасяджэнні журы па заканчэнні работы секцый падводзяцца вынікі і вызначаюцца пераможцы. Работы ўдзельнікаў ацэньваюцца ў адпаведнасці з крытэрыямі. Пераможцамі канферэнцыі становяцца вучні, якія набралі максімальную колькасць балаў па выніках другога этапу.

Пераможцы канферэнцыі ўзнагароджваюцца дыпломамі I, II і III ступеняў (да 40% удзельнікаў). Дыпломы пераможцам уручаюцца ў дзень правядзення Мележаўскіх чытанняў пасля заканчэння работы секцый.

Дадатак да Палажэння
аб Мележаўскіх чытаннях

Узор афармлення тытульнага ліста

АДДЗЕЛ АДУКАЦЫІ, СПОРТУ І ТУРЫЗМУ
АДМІНІСТРАЦЫІ ЧЫГУНАЧНАГА РАЁНА Г. ГОМЕЛЯ

Дзяржаўная ўстанова адукацыі
"Сярэдняя школа № 53 г. Гомеля"

Секцыя **"Мой родны кут"**

Вучэбна-даследчая работа

**"Каменныя крыжы"**

Выканала
Іванова Ірына Іванаўна,
вучаніца 10 класа
Кіраўнік
Пятроў Павел Пятровіч,
настаўнік гісторыі

Гомель, 2024